Як праходзяць зборы на заключны этап рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры ў ГДУ Скарыны?

Рэспубліканская алімпіяда — гэта цэлае спаборніцтва інтэлектуалаў! Правядзенне такога мерапрыемства гуртуе адораных вучняў, чые сэрцы гараць смагай пазнання шматвяковых традыцый роднай культуры і бясконцых граняў моўнай спадчыны. Фінальны этап патрабуе ад удзельнікаў шырокіх ведаў у кожнай галіне мовы і ўменні выконваць заданні living складанасці. Алімпіяда раскрывае багатую палітру лінгвістыкі: ад марфалогіі да аналізу творчасці пісьменнікаў-юбіляраў.

Зоя Уладзіміраўна Шведава (кандыдат філалагічных навук, дацэнт) распавядае аб заданнях і частых памылках:

– Традыцыйна, на III этапе алімпіяды вучні пішуць водгук на твор і выконваюць комплексную работу па беларускай мове і літаратуры. Прапанаваныя ў комплекснай рабоце заданні ахопліваюць розныя раздзелы сучаснага мовазнаўства, а таксама выяўляюць веды па гісторыі і тэорыі беларускай літаратуры. Матэрыял заданняў базіруецца на школьнай праграме, пры гэтым правяраецца мысленчая самастойнасць і кругагляд. Што тычыцца памылак, а значыць, на што трэба звярнуць увагу ў падрыхтоўцы па мове: - вызначэнне роду назоўнікаў; - марфемная будову слова; - від сувязі ў словазлучэнні, тып выказніка, віды аднасастаўных сказаў, размежаванне аднасастаўных і двухсастаўных сказаў; - пераклад тэксту з рускай мовы на беларускую.

“Век жыві - век вучыся"— фраза, якая апісвае штодзённую працу выкладчыкаў. Настаўнікі выступаюць незаменнымі праваднікамі на шляху да вяршыняў. Асновай падрыхтоўкі становіцца камунікацыя педагогаў і вучняў, карпатлівая праца над пасткамі ў заданнях. Усім хітрасцям алімпіяды па беларускай мове і літаратуры навучае прафесарска-выкладчыцкі склад ГДУ Скарыны, чый узровень умення знаходзіць агульную мову з навучэнцамі дапамагае раскрыць патэнцыял кожнага вучня на максімум.

Алена Аляксандраўна Кастрыца (кандыдат філалагічных навук, дацэнт) дае каментар пра сувязь універсітэта са школамі і гімназіямі:

– Большасць нашых выкладчыкаў адгукаецца на просьбы аб кансультацыях па складаных пытаннях літаратуразнаўства і лінгвістыкі, дапамагае падчас збораў па падрыхтоўцы да прадметных алімпіяд. У школах і гімназіях заключаны дагаворы аб супрацоўніцтве. Гэта важны складнік узаемакарысных стасункаў. У нашым універсітэце праводзяцца прафарыентацыйныя сустрэчы, на якіх кансультацыі могуць атрымаць не толькі вучні адносна паступлення, але і настаўнікі па прафесійных пытаннях.

Беларуская літаратура з’яўляецца галоўным інструментам абароны і развіцця мовы. Наша пісьменнасць — каштоўная спадчына. Тут кожны знаходзіць твор, які дапамагае зразумець свет і знайсці сябе.

Анжэла Мікалаеўна Мельнікава (доктар філалагічных навук, прафесар) адказвае на пытанне:

***Які, на Ваш погляд, самы аптымістычны, жыццясвярджальны твор беларускай літаратуры?***

– “Ладдзя Роспачы” Уладзіміра Караткевіча. Галоўны герой твора Гервасій Выліваха – увасабленне нацыянальнага аптымізму і нязломнасці. Ён надзвычай прыгожы, высакародны, вясёлы, здольны пераадолець самыя неспрыяльныя абставіны і нават перамагчы саму Смерць: “Хлябчыце воцат і жоўць, перавозчыкі. У нас – свой эдэм. Не для вас”. На фінальным этапе навучэнцаў будзе суправаджаць абярэг — гэта вера выкладчыкаў.

Жадаем поспехаў юным майстрам слова!

Аўтар артыкула - Мілана Атрохава, вучаніца 11 класа Сярэдняй школы №44 г. Гомеля

















